## НАСТОЛЬНАЯ ГУЛЬНЯ

ЭКА-ГУЛЬНЯ
РУЧНЫ ВЫРАБ

# НА ТРОХ КІТАХ

ЧАС ГУЛЬНІ 10-15
1-6 ЎДЗЕЛЬНІКІ

**СКЛАД ГУЛЬНІ:** 6 драўляных дыскаў • 6 драўляных слупкоў • 30 драўляных шайбачак • 1 драўляны кубік • правілы гульні.

*Мы самі вырашаем, з чаго ствараецца ўласны Сусвет: з шара альбо плоскага дыска, з сілы прыцяжэння альбо чарапах ды кітоў. Сёння вам давядзецца будаваць свой Сусвет з драўляных дэталяў. Але, адважныя Стваральнікі Сусвету, будзьце ўважлівыя: ад стварэння да руйнавання – адзін неасцярожны крок.*

У настольнай гульні “На трох кітах” гульцам будзе прапанавана пабудаваць і ўтрымаць свой асабісты “сусвет” на аснове трох складнікаў – драўляных слупкоў, дыскаў і шайбачак. Парадак размяшчэння дэталяў вызначыць лёс – шасціграннны кубік.

**МЭТА ГУЛЬНІ:** выставіць усе дэталі і не разваліць драўляную канструкцыю.

**ХОД ГУЛЬНІ:**
- выстаўце драўляны слупок і пакладзіце на яго дыск;
- абярыце ўдзельніка, які пачне гульню;
- гулец кідае кубік і вызначае від дэталі, якую павінен выкарыстаць;
- гулец ставіць дэталь на канструкцыю;
- калі канструкцыя не разваліцца, ходзіць наступны гулец;
- калі канструкцыя разваліцца, гульня адразу спыняецца.

**Кубік вызначае дэталь**, якую гулец павінен паставіць.
Звярніце ўвагу: кубік вызначае від дэталі, памер дэталі абірае гулец сам.

**Значэнне сімвалаў на кубіку:**

– дыск, – слупок, – шайбачка, – дзве шайбачкі.

**КАНЕЦ ГУЛЬНІ:** Гульня заканчваецца альбо калі драўляная канструкцыя развалілася, альбо калі ўсе дэталі выстаўлены. **Апошняй дэталлю лічыцца кубік,** ён выстаўляецца зверху ўсёй канструкцыі.

## АБЯРЫЦЕ РЭЖЫМ ГУЛЬНІ:

**РЭЖЫМ КАМАНДНЫ.** Вы гуляеце супраць гульні. Перамагаеце, калі заданне выканана поўнасцю і выкарыстаны ўсе дэталі (памятайце пра кубік). Вы сумесна альбо перамагаеце, альбо прайграеце. **У гэтым рэжыме можна гуляць нават аднаму.**

**РЭЖЫМ СПАБОРНІЦТВА.** Тут кожны гуляе сам за сябе і мае поўнае права ствараць для супернікаў пасткі і небяспечныя сітуацыі. Прайграе той, хто разваліў драўляную канструкцыю. Пераможцам лічыцца папярэдні гулец.

**ГУЛЬНЯ НА ВЫБЫВАННЕ (ТУРНІР).** Вы можаце правесці серыю гульняў. З кожнай гульнёй будзе выбываць адзін гулец – той, хто разваліў драўляную канструкцыю. Калі ўсе дэталі выстаўленыя, то прайграе гулец, чый ход павінен быць наступным.
Ва ўсім астатнім кіруйцеся класічнымі правіламі.

## ПАРАДЫ:

- Пасля таго, як вы выставілі дыск, усе іншыя дэталі варта выстаўляць толькі вышэй. Да гэтага моманту вы можаце змясціць на папярэднім дыску неабмежаваную колькасць шайбачак і слупкоў.
- Калі патрэбны від дэталяў скончыўся, бярыце любую дэталь на ваш выбар.
- Звярніце ўвагу, што дэталі маюць розныя памеры. Калі хочаце зрабіць гульню больш складанай, пачніце яе з дыска і слупка меншага памеру.
- Пры гульні з малымі дзеткамі можаце наадварот спрасціць гульню: пабудуйце канструкцыю з слупка і дыска, а далей гуляйце толькі шайбачкамі.
- Дасылайце нам на пошту фотаздымкі сваіх канструкцый, альбо скідвайце іх у сацыяльныя сеткі з хэштэгам *#3kiti #натрохкітах.*

**А•ЧАТЫРЫ**
творчае згуртаванне

*Гульня распрацавана* творчым згуртаваннем **"А-чатыры"**
*Распрацоўка гульні:* **Віктар Урублеўскі, Антон Янкоўскі**
*Ілюстратар гульні:* **Наста Янкоўская**
*Над гульнёй таксама працавалі:* **Андрэй Ціцяк, Ала Міцэвіч, Ганна Ліпчанская, Дзяніс Вашкевіч.**

*Кантакты:*
**a4games.by**
**vk.com/a4grup**
**a4gamesby@gmail.com**

